# Вясёлы гоман жывой вясны.

У Беларусі ў сакавіку стартуе агульнаеўрапейская кампанія "Жывая вясна". Ужо чацвёрты год запар сумесна з жыхарамі ўсёй Еўропы беларусы назіраюць за прылётам вестуноў вясны — пералётных птушак. Каардынатар кампаніі — грамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны", паведаміў рэдакцыі спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан Шайкін.

У якасці вяшчальнікаў вясны прапанаваны найбольш вядомыя і папулярныя віды пералётных птушак, якія добра вядомыя ўсім людзям. Гэта белы бусел, вясковая ластаўка, звычайная зязюля і чорны свіргуль. Навіной аб тым, што вы ўбачылі першых пералётных птушак гэтых відаў, уласнымі назіраннямі можна падзяліцца на сайце www.springalive.net. Тут адлюстраваны назіранні за птушкамі з усіх куткоў Еўропы. Чым больш паведамленняў — тым хутчэй кожная з краін набывае на карце Еўропы больш насычаны аранжавы колер, які сімвалізуе надыход жывой вясны.

Сёлета свае назіранні можна таксама даслаць у выглядзе SMS-паведамленняў на кароткі нумар 0841. Паслуга даступная абанентам Velcom (кошт 220 рублёў) і МТС (190 рублёў). Летась агульная колькасць паведамленняў аб птушках у рамках кампаніі "Жывая вясна" склала больш за 40 тысяч. Найбольшую актыўнасць праявілі жыхары Мядзельскага раёна — імі адзначана звыш 500 назіранняў.

Ужо сёння ў паўднёвых краінах Еўропы пачаўся масавы прылёт птушак. Усе чатыры віды, што сімвалізуюць надыход жывой вясны, адзначаны на Мальце, у Італіі і Партугаліі. Рухаецца вясна ўжо па Кіпры і Арменіі. Першыя вестуны вясны прыляцелі ў Іспанію і Францыю. Гэтымі днямі на тэрыторыю Гродзенскай і Брэсцкай абласцей прыляцелі першыя разведчыкі вясны — палявыя жаўрукі і шпакі.

***Сяргей ПАЛІНІН.***

**Источник:** Звязда.-2009.-7 сак.-С. 2.